П ОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЇЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 77 (1044) | ЧАЦЬВЕР, 3-га красавіка 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ X.

Кошт асобнага №—2 кап.

За сыстэматычную работу з батрацтвам і беднатой

Усім ак[illegible]угкомам і райкомам ЛКСМБ

Высунутыя партыяй задачы па соцрэконструкцыі с-гаспадаркі, ліквідацыя кулацтва як клясы на грунце суцэльнай колектывізацыі, організацыя працы ў колгасах, бальшавіцкае правядзеньне ўсіх намечаных плянаў вясеньняй пасеўкампаніі, магчыма выканаць пры большым згуртаваньні навакол партыі батрацтва і бядняцтва ў саюзе з серадняком і батрацка-бядняцкай моладзьдзю.

У той жа час матар'ялы, якія маюцца ў ЦК ЛКСМБ (агляд Мазырскай організацыі, весткі атрыманыя ад брыгадзіраў ЦК КСМ, даклады Бабруйскай, Магілеўскай, Аршанскай організацый), гавораць аб тым, што пытаньням дапамогі партыі ў рабоце з беднатой і батрацка-бядняцкай моладзьдзю організацыямі не ўдзеляецца належнае ўвагі, і мясцамі не даацэньваецца гэтая работа, што бязумоўна зьяўляецца ні чым іншым, як праяўленьнем правага ўхілу на практыцы, з якім неабходна весьці бязьлітасную і рашучую барацьбу.

Яшчэ больш разгарнуць работу сярод батрацтва і беднаты

Ажыцьцяўленьне палітыкі партыі патрабуе ад усёй комсамольскай організацыі, ад кожнай комсамольскай ячэйкі і кожнага комсамольца паясобку рашучага пералому ў рабоце сярод батрацка-бядняцкай моладзі. Прыдаючы вялікае політычнае значэньне гэтай рабоце, ЦК ЛКСМБ пастанавіў на працягу красавіка м-ца правесьці па ўсіх с-саветах сходы батрацкай-бядняцкай моладзі з наступнымі пытаньнямі: задачы комсамолу і батрацка бядняцкай моладзі па організацыі ўнутранай працы ў калгасах і ўдзелу іх у вясеньней пасеўкампаніі. Работа ЛКСМБ сярод батрацка-бядняцкай моладзі і задачы росту за лік апошніх.

Праводзімыя па с-саветах сходы батрацка-бядняцкай моладзі павінны зрабіць пералом у рабоце камітэтаў комсамолу і ўсёй організацыі ў гэтай галіне. Сходы павінны згуртаваць і мобілізаваць увагу батрацка-бядняцкай моладзі навакол выкананьня наступных задач:

У справе дапамогі парторганізацыям па пытаньнях організацыі і стварэньня пры ўсіх колгасах, с-саветах батрацка-бядняцкіх груп і работы сярод іх, прыцягненьня ў гэтыя групы батрацка-бядняцкае моладзі, большага ўдзелу комсамольскіх ячэек у рабоце організуемых і існуючых груп.

Замацаваць існуючыя колгасы

Галоўнае месца ў склікаемых сходах, як і ўва ўсёй рабоце сярод батрацка-бядняцкай моладзі, павінны заняць пытаньні гаспадарчага замацаваньня існуючых колгасаў. Дэталёва абгаварыць пытаньне організацыі працы, правільнай растаноўкі і поўнага скарыстаньня рабочай сілы ў колгасах, пытаньне разгортваньня соцспаборніцтва і ўдарніцкага руху, максымальнага разгортваньня самадзейнасьці, ініцыятывы і вытворчасьці ў колгаснай рабоце.

Чарговай політзадачай, якая павінна быць абгаворана на склікаемых сходах батрацка-бядняцкай моладзі, зьяўляецца растлумачэньне пастаноў ЦК УсеКП(б) і КП(б)Б, таксама і артыкулу т. Сталіна ў справе барацьбы з скрыўленьнямі лініі партыі ў колгасным будаўніцтве, як: голае адміністраваньне і г. д.

Усю ўвагу комсамольскай організацыі і батрацка-бядняцкай моладзі трэба сконцэнтраваць на выпраўленьні маючыхся прарываў і недахопаў у рабоце колгасаў, каб на хаду выправіць іх, прымаючы актыўны ўдзел у організуемых пробных выхадах у поле, у пераводзе колгасаў на новы статут, у абагульненьні рабочай жывёлы, у падрыхтоўцы да вясеньняй сяўбы і да сьвята першай баразны.

Не абмяжоўваючыся гэтымі сходамі трэба ўвесьці ў сыстэму работы комсамольскай організацыі на вёсцы скліканьне пэрыодычных нарад батрацка-бядняцкай моладзі для абмеркаваньня розных пытаньняў з такім разьлікам, каб уся батрацка-бядняцкая моладзь была ўсебакова асьведамлена ва ўсіх політычна-гаспадарчых кампаніях, зьвязаных з практычнай работай колгасаў і мясцовых організацый.

Пытаньне колектывізацыі беднаты і батрацтва яшчэ канчаткова і цалкам не вырашае пытаньня аб непатрэбнасьці абароны інтарэсаў батрацка-бядняцкай моладзі ў самых колгасах.

Згуртуем батрацка-бядняцкую моладзь—на барацьбу з клясавым ворагам

Комсамольскія ячэйкі павінны памятаць, што клясавая барацьба, у сувязі з правядзеньнем суцэльнай колектывізацыі і на грунце гэтага—ліквідацыі кулацтва як клясы, яшчэ больш абвострана. Адсюль, як вынік—неабходнасьць згуртаваньня ўвагі батрацка-бядняцкай моладзі на барацьбу з клясавым ворагам, які вядзе актыўную барацьбу супроць колгаснага будаўніцтва і імкнецца ўсялякімі спробамі падарваць колгасы з сярэдзіны, а гэтак сама на выкарчоўваньне ўласьніцкай псыхолёгіі, розных вузка-спажывецкіх настрояў, эксплёататарскіх праскокаў з нядбайнымі і хваробнымі момантамі і зьявішчамі, якія маюць месца ў рабоце асобных колгасаў да батрацка-бядняцкай моладзі, за правільнае вырашэньне пытаньня організацыі колектыўнага будаўніцтва і колектыўнай вытворчасьці.

Пытаньням росту комсамольскай організацыі за лік батрацка бядняцкай моладзі неабходна зараз як ніколі, зьвярнуць асаблівую ўвагу галоўным чынам на выкананьне лёзунгу аб 100 проц. абхопе комсамолам батрацкай моладзі. Сходы батрацка-бядняцкай моладзі павінны палепшыць сыстэматычную работу комсамольскай організацыі ў гэтым напрамку.

Праводзімыя па с.-саветах сходы батрацка-бядняцкай моладзі павінны пакласьці пачатак штодзённай, плянамернай рабоце комсамольскай організацыі сярод гэтай моладзі. Комсамольская організацыя павінна памятаць, што: „Толькі чужыя УсеКП і УсеЛКСМ элемэнты могуць ігнараваць карэнную задачу партыі, задачу організацыі беднаты і батрацтва".

ЦК ЛКСМБ.

Адказ провокатарам

Міжнародны зьезд прыяцеляў СССР выбраў удалы час для сваёй работы. Зараз, калі пад рознымі ссўсамі імкнуцца організаваць цкаваньне Савецкага Саюзу, зьезд набывае асабліва важнае політычнае значэньне.

З Канады, Алжыру, з Амэрыкі, Англіі, Італіі,—адусюль прыбылі ў Бэрлін людзі, гатовыя аддаць сваё жыцьцё для таго, каб абараніць першую ў сьвеце пролетарскую дзяржаву.

Зьезд адчыніўся выступленьнем тав. Мюнцэнбэрга. Ён паведаміў, што нямецкі ўрад адмовіў даць дазвол на ўезд у Нямеччыну прадстаўніку савецкіх профсаюзаў тав. Яўрэінаву.

Гэта заява была спаткана бурай протэстаў па адрасу нямецкага ўраду

— Зьезд стане выходным пунктам для адзінага фронту ўсіх працоўных у іх барацьбе ў абарону СССР,—вось асноўная ўстаноўка.

Дэлегацыя рурскіх рабочых, якая вітала зьезд, заявіла:

Працоўныя Руру гатовы ў любую хвіліну стаць на абарону СССР.

Прыяцелі СССР цікавяцца выкананьнем пяцігадовага пляну ў першы год. Дакладчык тав. АЛЬБРЭН расказаў зьезду аб росьце будаўніцтва ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі СССР.

— Калі быў складзен пяцігадовы плян, рэнегат — Каўцкі назваў яго фантастычным, які непазьбежна прывядзе да банкроцтва. Працоўныя Савецкага Саюзу адказалі на гэта „прароцтва" цьвердым рашэньнем выканаць пяцігодку ў чатыры гады.

У спрэчках выступала шмат дэлегатаў. Яны зазначалі, што неабходна разгарнуць шырокую кампанію пропаганды сярод працоўных, каб разьбіць ні на чым не абгрунтаваную думку аб тым, што быццам няма ніякай пагрозы вайны.

Дэлегатка Амэрыкі та в. Рудкіст гаворыць:

— Рабочыя Злучаных Штатаў праявілі сваю салідарнасьць з працоўнымі СССР шляхам масавых дэмонстрацый 6-га сакавіка. Дэмонстрацыі прашлі ня толькі пад лёзунгам барацьбы з беспрацоўем, але і пад лёзунгам абароны Савецкага Саюзу і протэсту супроць організуемага Рымскім папай крыжовага паходу.

Капіталізм задыхаецца ў крызісе сваёй гаспадаркі. Грандыёзная армія беспрацоўных дасягнула дзесяткаў мільёнаў чалавек. Уздым рэволюцыйнага руху ў капіталістычных краінах, посьпехі соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР,—усё гэта выклікала організацыю антысавецкага цкаваньня.

Ангельскі дэлегат Томбель, які выступіў на зьезьдзе з дакладам аб вайсковых падрыхтаваньнях супроць СССР, зазначаў, што за кулісамі Лёнданскай конфэрэнцыі „разброеньня" ідуць перагаворы аб морскім паходзе супроць Савецкай Расіі. Камандуючы бесарабскімі войскамі адкрыта заявіў:

— Думаю, што война супроць СССР пачнецца яшчэ ў 1930 годзе...

Вывады: Саюз прыяцеляў СССР павінен разгарнуць энэргічную работу ў масах з мэтай організаваць актыўную кампанію і масавы рух у абарону Савецкага Саюзу.

Трэці даклад зрабіў профэсар Францыс Журдэн. Ён зазначыў на неабходнасьць увязаць работу прыяцеляў СССР з барацьбой комуністых партый і рэволюцыйных рабочых організацый. Прадстаўнік рабоча-сялянскага блёку Румыніі Рацэвну падкрэсьліў асаблівую важнасьць мяжуючых з СССР краін.

Капіталістыя гэтых краін граюць ролю правакатараў у анты-савецкім паходзе. У мінулым годзе францускі генэрал Пэтэн, сумесна з Пілсудзкім і румынскімі генштабістымі распрацаваў падрабязны плян падрыхтоўкі вайны супроць СССР.

ЗЬЕЗД ПРЫНЯЎ РЭЗОЛЮЦЫЮ, ЯКАЯ ГАНЬБІЦЬ АНТЫ-САВЕЦКУЮ ПАЗЫЦЫЮ ЎРАДУ МАКДАНАЛЬДА

Дэлегаты зьезду ад імя дзесяткаў і сотен тысяч пролетарыяў—СССР—у сваёй рэзолюцыі яшчэ раз заявілі, што рабочая кляса усяго сьвету з вялізарнейшым захапленьнем сочыць за ростам Савецкай дзяржавы.

Зьезд зачыніўся. ДЭЛЕГАТЫ РАЗЬЕХАЛІСЯ ПА СВАІХ КРАІНАХ, КАБ ПРАЦЯГВАЦЬ УПАРТУЮ РАБОТУ, РАБОТУ І БАРАЦЬБУ СУПРОЦЬ ВОРАГАЎ РАБОЧАЙ КЛЯСЫ.

Жорсткія крывавыя сутычкі ў Францыі

Пролетары геройчна выступаюць супроць тэрору соцыял-фашыстых

ПАРЫЖ, 1. 31 сакавіка ўвечары ў Ленсе (цэнтр вугольна-прамысловага раёну Па-дэ-Кале) адбыліся крывавыя сутычкі рэволюцыйных шахцёраў з соцыялістымі і паліцыяй.

Соцыялістыя назначылі ў Ленсе вялікі мітынг і організавалі папярэдня дэмонстрацыю к дому профсаюзаў, дзе павінен быў адбыцца мітынг. Гэта дэмонстрацыя была спаткана тысячамі шахцёраў, якія сабраліся на вуліцах Ленса, моцнымі сьвісткамі і выкрыкамі: „Прэч соцыял-фашыстых, няхай жывуць саветы!" Тыя-ж выклікі раздаваліся з шэрагаў некалькіх тысяч шахцёраў і тэкстыльшчыкаў, якія, па прапанове компартыі, зьмяшаліся з афіцыйнай дэмонстрацыяй соцыял-фашыстых.

Запалоханыя такім прыёмам соцыялістыя, сумесна з паліцыяй устанавілі строгі кантроль над уваходам у дом профсаюзаў, не дапускаючы «западазроных да комунізму». Абураныя гэтымі зьбіваньнямі шахцёры кінуліся на соцыял-фашыстых і паліцыю. Адбылася жорсткая схватка. Па загаду гарадзкога галавы, соцыялісты Маэса, паліцыя адкрыла агонь па рабочых, калі сутычка ўжо скончылася. У выніку 14 рабочых ранены.

У горадзе за апошнія ночы адбываліся дэмонстрацыі пад лёзунгам барацьбы з соцыял-фашызмам і паліцэйскім тэрорам. Падзеі ў Ленсе ня толькі яшчэ раз падкрэсьлілі саюз паміж паліцыяй і соцыял-фашызмам, але і паказалі, што рабочыя разумеюць сапраўдную сутнасьць соцыял-фашызму.

Нябачны рост беспрацоўя у Англіі

ЛЕНДАН, 31. Па вестках міністэрства працы, на 17 сакавіка ў Англіі знаходзілася на вучоце біржы працы 17.621.800 беспрацоўных. Такім чынам, колькасьць беспрацоўных вырасла за апошні тыдзень на 57.993 чалавекі і на 439 346 чалавек з 17 сакавіка 1929 году.

Комэнтыруючы гэтыя лічбы, „Таймс" піша: „Не падлягае ніякаму сумненьню, што мы перажываем зараз пэрыод самай вострай, пасьля 1921-22 году, дэпрэсіі. Такіх памераў беспрацоўе дасягнула толькі ў 1926 годзе, пасьля ўсеагульнай забастоўкі. Маецца небясьпека, што гэты рост будзе яшчэ працягвацца, бо далёка ня ўсе беспрацоўныя зарэгістраваны органамі міністэрства працы.

Нанкін падрыхтоўвае зброю

Мукдэн адхіліў просьбу Нанкіну

ХАРБІН, 1. Нанкінскі ўрад зьвярнуўся да мукдэнскага з просьбай тэрмінова падрыхтаваць зброю для патрэб Нанкіну ў мукдэнскім арсэнале і прадставіць у распараджэньне нанкінскага ўраду паветраную флётылію. Мукдэнскі ўрад адмовіў, заявіўшы, што арсэнал ня мае магчымасьці выканаць новую работу, а паветраная флётылія вельмі пацярпела ў часе конфлікту з СССР і ня можа быць скарыстана.

Фашысцкая Польшча перажывае глыбокі гаспадарчы крызіс

Тэкстыльная прамысловасьць скарачаецца. Тысячы рабочых будуць выкінуты на вуліцу

ВАРШАВА, 2. Гаспадарчы крызіс у Польшчы абвастраецца. Павялічылася колькасьць банкроцтваў. Газэта „Гандэльсвельт" чакае ў бліжэйшыя часы шэрагу новых банкроцтваў. Газэта прадбачыць новае скарачэньне вытворчасьці тэкстыльнай прамысловасьці, у выніку чаго ізноў тысячы рабочых будуць выкінуты на вуліцу. Па вестках „Гандэльсвельт" трыкотажная прамысловасьць Польшчы зараз працуе ўсяго толькі з нагрузкай у 25 проц. нагрузкі мінулага году. Гаспадарчы крызіс Польшчы па думцы «Гандэльсвельт» яшчэ не дасягнуў вышэйшага пункту свайго разьвіцьця і надзвычайнае абвастрэньне яго наступіць у ліпені-верасьні.

Па Савецкім Саюзе

За 6 месяцаў Донбас даў 19368 тысяч тон вугалю

ХАРКАЎ, 2. Падведзены папярэднія вынікі па рабоце вугольнага Донбасу ў першым паўгодзьдзі сучаснага гаспадарчага году. За 6 месяцаў здабыта 19 мільёнаў 368 тысяч тон вуглю, што складае 96,6 проц. паўгадавой праграмы. За гэты-ж пэрыяд Донбас не даў краіне 687 тысяч тон. За апошнія месяцы Донбас вельмі прыкметна палепшыў сваю работу.

Зачыніўся ўсеукраінскі зьезд камітэтаў незаможных сялян

ХАРКАЎ, 2. Учора вечарам зачыніўся ўсеукраінскі зьезд камітэтаў незаможных сялян. Усе рэзолюцыі па дакладу прыняты аднагалосна. Зьезд пастанавіў узьняць перад УсеЦВК хадайніцтва аб узнагароджаньні тав. Патроўскага ордэнам Чырвонага Сьцягу за яго выключныя заслугі, як організатара і нязьменнага кіраўніка клясавымі баямі украінскай беднаты. Адбыўся першы пленум ЦК незаможных сялян новага скліку. Старшынёю аднагалосна пераабраны тав. Патроўскі.

15 красавіка пачынаецца чыстка лесазагатоўчага апарату

МАСКВА, 2. НК РСІ і цэнтральныя камітэты саюзаў сельска-гаспадарчых і лясных рабочых і дрэваапрацоўшчыкаў прынялі прапанову ЦК УсеЛКСМ аб чыстцы лесазагатоўчага апарату, прызнаўшы неабходным прыступіць да правядзеньня чысткі не пазьней 15 красавіка г. г. з тым, каб першыя два тыдні кастрычніка месяцу скарыстаць для правядзеньня падрыхтоўчай работы да чысткі.

Генэральная праверка працягнецца да 12-га красавіка

У зьвязку з наступіўшым пахаладаньнем некалькі аддаляюцца тэрміны пачатку непасрэднай сяўбы. Гэта дае магчымасьць прадоўжыць і тэрмін генэральнай праверкі.

Апошнім днём праверкі вызначаецца 12-га красавіка.

Падагуленыя сводкі з раён ў (гл. у „Зьвязьдзе" № 71 тэлеграму ўсім райкомам КП(б)Б аб праверцы падрыхтоўкі да сяўбы) павінны быць дасланы на адрас рэдакцыі не пазьней 14-га красавіка.

Некаторая адтэрміноўка дае, такім чынам, магчымасьць яшчэ больш дасканала праверыць падрыхтаванасьць месц да сяўбы, яшчэ больш зжыць недахопы, якія ёсьць.

„ЗЬВЯЗДА"

Вопыт Варанцэвіцкай ячэйкі ЛКСМБ

Аб аднэй ячэйцы

Вёску Варанцэвічы, Талочынскага раёну ў мінулым абкружалі з аднаго боку буйныя хутары Кохаваўскага раёну, з другога—хутары Масьцішча і буйны маёнтак пана.

Лепшая зямля была пад маёнткам і ў хутарах кулакоў.

У былым маёнтку зараз ужо красуецца колгас імя Сталіна,—арганізаваны тры гады таму назад. Колгас зьяўляецца прыкладным для суседніх вёсак і новаарганізаваных колгасаў.

Па свайму складу вёска Варанцэвічы бедная.

Сялянства вякамі прадавала сваю сілу магнату маёнтку і мясцоваму кулацтву. Варанцэвічы ў былым—крыніца прытоку сіл для эксплёатацыі.

На краі вёскі стаіць царква. Поп і дзяк „прасьвяшчалі“ народ, выхоўваючы яго ў духу „паслушнасьці“.

Кастрычнікавая рэволюцыя зьмяніла аблічча зямлі.

Магнатаў ня стала. Толькі кулацтва, застаўшыся на сваіх хутарох, імкнулася замацаваць свае пазіцыі. Але палітыка дыктатуры рашуча абмяжоўвала эксплёататарскія тэндэнцыі кулака. Цьвёрдым наступам на капіталістычныя элементы выціскаліся атрады кулакоў.

Батрацтва і бедната ў саюзе з серадняком пад кіраўніцтвам комуністычнай партыі вялі сьмяротную барацьбу з кулаком—прыступілі да перабудовы вёскі на соцыялістычны лад.

Гісторыя ячэйкі

У агні клясавай барацьбы арганізавалася Варанцэвіцкая комсамольская ячэйка. Слаба клясава загартаваныя, палітычна няпісьменныя комсамольцы, пры адсутнасьці партыйнага кіраўніцтва, падпалі пад уплыў папа.

Поп і дзяк прыклалі ўсе сілы, каб працу ячэйкі КСМ накіраваць па сваім клясавым шляху.

З гэтай мэтай:

Сын папа арганізоўвае і кіруе драматычным гуртком.

Дачка арганізоўвае швэйны гурток, стаўшы на чале работы гэтага гуртка.

Работа гэтых гурткоў праводзілася самастойна, пабудаваная надзвычайна хітра, умела, дзеля таго, каб усю моладзь, батрацтва, беднату і серадняцтва перацягнуць з комсамолу ў свае гурткі.

Пачаўся прыліў у папоўскія гурткі моладзі, а за імі і комсамольцаў.

Перацягнуўшы на свой бок сэкратара комсамольскай ячэйкі Лыкоўскага, поп стаў на чале ячэйкі.

Справы пашлі лягчэй. Уся ячэйка ўжо была на павадку ў папа і групоўкі кулацтва.

Дзеці папа і кулакоў пралезьлі ў комсамол.

Батрацтва і бедната пачалі выходзіць з комсамольскай ячэйкі. Ячэйка стала рупарам кулацкай і папоўскай агітацыі на вёсцы.

...Пазачарговая чыстка аздаравіла ячэйку.

Выключылі з комсамолу варожы элемэнт. Далі адпор папу і кулацтву. Чыстка паказала беднаце і батрацтву куды вяла „актыўная“ папоўская работа.

Вось—кароткая гісторыя комсамольскай ячэйкі і яе работа ў мінулым.

На новым шляху

У пачатку 1929 г. ячэйка пачала жыць па новаму.

Абрана новае бюро.

Ячэйка адразу дала адчуць сябе, як клясавая організацыя. Батрацка-бядняцкая моладзь пачала групавацца вакол ячэйкі.

Гэта адчулі кулакі.

Комсамольцы ўпарта ўзяліся за работу.

Шэрагі ячэйкі пачалі расьці за лік батрацкай і бядняцкай моладзі. Калі ў мінулым батракоў у ячэйцы бадай што ня было, дык зараз іх налічваецца 8 чалавек. Ёсьць адзін рабочы, 10 беднякоў, 6 серадзякоў і 2 служачыя—коопэратары-вылучэнцы.

Ячэйка паступова пачала браць перадавыя пазыцыі ва ўсёй рабоце. Ні адно гаспадарча-палітычнае мерапрыемства, кампанія, грамадзкая работа, не праходзяць міма ячэйкі.

Усюды—комсамолец.

Сартыроўка насеньня да веснавой сяўбы.

На гаспадарчым фронце ініцыятыва ячэйкі спачатку выліваецца ў організацыю агнятрывалага таварыства. Усе комсамольцы шчыра бяруцца апраўдаць гэтую ідэю і паказаць сялянству карысьць пабудовы агнятрывалых будынкаў.

Ідзе організацыя машыннага таварыства. Комсамольцы сумесна пачынаюць організоўваць апрацоўку зямлі, дапамагаюць беднаце, утвараючы суботнік і інш.

На гэтым ініцыятыва ня спыняецца.

Ячэйка ідзе далей...

Складаецца думка сярод бедняты і серадзякоў утварыць мэліорацыйнае таварыства. Таварыства організоўваецца, і на прыкладах яго работы сялянства бачыць добрую ініцыятыву ячэйкі.

Цагельны завод не абходзіцца без комсамольцаў. Комсамолец Сідарэнка, зьмяніўшы ранейшага „спэца“, які толькі браў грошы і псаваў цагліны, давёў, што цагельны завод можа апрацоўваць цэглу добрай якасьці.

Ініцыятыва і захапленьне гаспадарчай працай не заглушае працы і ў другіх галінах.

Згуртаваўшы навакол сябе настаўніцтва суседніх вёсак, ячэйка паступова вырашае задачу ліквідацыі няпісьменнасьці.

Такім чынам прыкладная практычная работа кавала паступова аўтарытэт ячэйкі, узьнімала практычную кваліфікацыю і політычны ўзровень комсамольца.

Ячэйка станавілася моцнай клясава-сьвядомай політычнай організацыяй.

Комсамольцаў што дня ўсё болей захаплялі гаспадарчыя пытаньні... Яны загаварылі аб поўнай перабудове Варанцэвіч на соцыялістычны лад.

Разгарнуць работу сярод батрацтва і бедняты

Вурок мінулага становішча і работы ячэйкі паказаў, што адарваўшыся ад бедняты і батрацтва, падпаўшы пад уплыў папа і кулацтва, ячэйка спаўзла з клясавых рэек, стала няздольнай праводзіць генэральную лінію партыі на вёсцы.

Ячэйка робіць рашучы паварот у адносінах работы з беднатой і батрацтвам як з дарослымі, так і моладзьдзю.

Пад кіраўніцтвам Воўкаўскай партыйнай ячэйкі комсамольцамі ў в. Варанцэвічы часта скліваюцца батрацка-бядняцкія сходы, праводзяцца гутаркі па важнейшых політычных пытаньнях на вёсцы. Ставяцца пытаньні на большым удзеле батрацтва і бедняты, аб іх ролі ўва ўсёй рабоце сельсавету, аб колектывізацыі і шэрагу іншых пытаньняў.

Практычная работа яшчэ больш спрыяла згуртаваньню навакол ячэйкі моцнай групы батрацка-бядняцкага актыву з моладзі і дарослых.

Работа гурткоў ня спыняецца.

Комсамольцы штовечар заняты напружанай работай, як унутры сваёй ячэйкі, так і сярод бедняты і батрацтва вёскі.

Добрай пастаноўкай працы гурток бязбожнікаў зацікавіў моладзь і дарослых сялян і ў выніку самымжа сялянствам было ўзьнята пытаньне аб зачыненьні Варанцэвіцкай царквы.

Зараз царква зачынена. Поп выселен з вёскі.

У яго доме організавана хата-чытальня.

Я. Красуцкі.

(Працяг будзе).

Ахвяра бюрократычных агаворак

На рагачэўскай картоннай фабрыцы па віне адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу загінула бронь-вучаніца СОБАВА АЛЕСЯ

„Характар пашкоджаньня—сьмерць“. Так гласіць акт абсьледваньня няшчаснага выпадку на картоннай фабрыцы імя „Сталіна“ ў Рагачове.

Пацярпеўшая Собава Алеся—бронь-вучаніца. Працавала каля 10 месяцаў на электрастанцыі фабрыкі па нагляду за работай матораў і дынамамашын „пад наглядам манцёраў“.

Былі выпадкі, калі яна—Собава—выконвала сякія-такія самастойныя работы, асабліва калі манцёр адлучаўся па якіх-небудзь справах. Наглядала таксама і за вадакачкай. Забойства Собавай тады і здарылася, калі яна пашла ў насоснае аддзяленьне паглядзець ці ўсё спраўна, ці ня трэба адкачваць ваду, бо за гэтым вельмі пільна трэба сачыць, асабліва ў час уздыму вады. Манцёраў у гэты час ня было. Собава вельмі добра адчувала адказнасьць за тую працу, на якую яна была пастаўлена. У час агляду колектара яна вопраткай зачапілася за выступаючыя незакрытыя балты на муфтах валоў трансмісій, вопратка пачала наматвацца на вал. Собаву зьбіла з ног і перакінула яе праз трансмісію. Адразу наступіла і сьмерць.

Толькі праз некаторы час прышоў манцёр і спахапіўшыся, што няма бронь-вучаніцы, кінуўся ў насоснае аддзяленьне, дзе і знашоў яе забітай.

Як бачна, Собава добрасумленна адносілася да сваіх абавязкаў; не чакала пакуль прыдзе манцёр, бо ў гэты час можа што-небудзь здарыцца на станцыі, папсавацца і мець уплыў на ўсю фабрыку. Собава—на чаку, і яна пашла наглядаць.

Але-ж ці добрасумленна адносіліся да сваіх абавязкаў кіраўнікі фабрыкі, тэхнічны пэрсанал і фабрычныя організацыі? Бязумоўна—не. Аб гэтым вельмі яскрава гаворыць зробленая дырэктарам фабрыкі на акце агаворка: „что использовывали учеников для обслуживания водокачки—мне не было известно“.

Лепшай бюрократычнай агаворкі жадаць і прыдумаць ніяк нельга. Чаму вы, гр-н дырэктар, ня ведаеце, што ў вас робяць вучні? Як іх навучаюць? Чаму вы, як дырэктар, ня цікавіцеся такім сур'ёзным пытаньнем, як падрыхтоўка кадраў? Які вы пасьля гэтага гаспадар на фабрыцы, на якога партыя і ўрад усклалі абавязкі ў парадку адзінаначальля адказваць за ўсе бакі жыцьця на фабрыцы? Гэта для дырэктара дробязь, але-ж гэта таксама паказвае, што на фабрыцы працдысцыпліна пастаўлена незадавальняюча. Манцёр вышаў, пакінуўшы такі адказны вучастак пад наглядам 10-ці месячнага вучня, а матар'ялы гавораць аб тым, што вучні часта застаюцца адны. Чамусьці дырэктар гэтым пытаньнем ня цікавіўся.

Далей. Пытаньні тэхнікі бясьпекі ня цікавілі дырэктара. Матар'ялы абсьледваньня гавораць, што: „на мэханізмах насоснай ня было ніякіх забясьпечных прыладаў, муфты і валы варочаючымісь зьверху непакрытымі балтамі ня мелі ніякіх агражджэньняў“.

А дырэктывы ЦК УсеКП(б) пра ажыцьцяўленьне рашучых мерапрыемстваў па аздараўленьню ўмоў працы на прадпрыемствах і падняцьцю тэхнікі бясьпечнасьці работ зусім яскрава гавораць аб тым, што павінна быць у гэтай галіне, але для дырэкцыі картоннае фабрыкі гэта мусіць не абавязкова. Для таго, каб выканаць паказаныя дырэктывы дырэктару відаць трэба было, каб Собава аказалася пакалечанай, з раздробленымі скіўцамі і разьбітым чэрапам.

Гэтага ніхто не дазволіць. Такія кіраўнікі не апраўдваюць давер'я рабочае клясы! Мы рашуча патрабуем зьняцьця з работы і прыцягненьня да судовай адказнасьці ўсіх вінаватых і ў першую чаргу дырэктара.

Гольдзенбэрг.

Малюнак з часопісі „Крокодил“

Галавацяп: курэй аграмадзіў, а як быць з варонамі? Ня ведаю!

Працоўнае сялянства капіталістычных краін рыхтуецца да грандыёзных боек з капіталам

Апошні конгрэс Комуністычнага Інтэрнацыяналу з дастатковай яскравасьцю паказаў, што капіталістычная гаспадарка ідзе да ўпаду і крызісу, што так званая стабілізацыя капіталізму пабудавана на пяшчаным фундаманце. Адсюль Выканком Комінтэрну зрабіў вывад аб няміннучым націску капіталістых на рабочую клясу і новым уздыме рэвалюцыйнага руху рабочых.

Гэтыя паказаньні Комінтэрну поўнасьцю апраўдаліся жыцьцём. Мы зьяўляемся сьведкамі вялізарнага прамысловага крызісу, бязупыннага росту беспрацоў'я ва ўсіх капіталістычных краінах і вялікага ўздыму рэволюцыйнага руху пролетарыяту. Аб гэтым сьведчыць і стачачны рух і баявое салідарнае выступленьне працуючых і беспрацоўных 6-га сакавіка.

Прамысловы крызіс суправаджаецца вялікім крызісам і ў сельскай гаспадарцы. Асабліва пакутуюць сялянскія раёны, якія выпрацоўваюць сыравіну для прамысловасьці. У сувязі з скарачэньнем вытворчасьці моцна ўпаў попыт, а разам з гэтым і цэны на бавоўну, какао, каву, каўчук, цукровы трасьнік і іншыя продукты. Ня лепш справа і ў зернавых раёнах. У Амэрыцы, напрыклад, бушэль пшаніцы (каля 67 фунтаў) каштуе зараз менш даляру (даляр—1 руб. 93 кап.).

Бядняцкае і серадняцкае сялянства паўсюды разбураецца, бяднее і пападае ў яшчэ большую кабалу да абшарнікаў, кулакоў і вясковых працэнтшчыкаў.

Батрацтва знаходзіцца ў нявыносных умовах. Фашысцкія ўрады катуюць сялян вялікімі падаткамі, якія зьядаюць усё, што застаецца ў сялян пасьля выплаты абшарнікам за арэнду зямлі і процантаў працэнтшчыкамі за пазычкі.

Такое становішча штурхае працоўнае сялянства на рэволюцыйныя выступленьні. У газэтах ужо адзначаўся цэлы шэраг выступленьняў сялян у Італіі, Грэцыі, Юга-Славіі, Баўгарыі, Румыніі, Польшчы, Нямеччыне, Францыі ды інш. краінах, ня кажучы ўжо аб выступленьні сялян у калёніях (Інда-Кітай, Эгіпэт, Індыя і г. д.).

Усе гэткія выступленьні звычайна падаўляліся ўрадамі абшарнікаў і капіталістых узброенай сілай. Пры гэтых падаўленьнях сялянскіх выступленьняў былі выпадкі самай дзікай, зьверскай расправы з сялянамі, якія спрабавалі падаць голас протэсту супроць абшарніцкага ўціску і бясправ'я.

Вось які выпадак нядаўна адбыўся ў Эгіпце.

Мясцовы абшарнік аблічыў батрака—Фэлаха (селяніна). Тады Фэлах разам з сваімі таварышамі прышоў да абшарніка і ўзяў у яго два цюкі бавоўны. Сельскі паліцэйскі чыноўнік убачыў у гэтым „бунт“. Ён арыштаваў Фэлаха і расьпяў яго на драўляным крыжы. Рукі і ногі няшчаснага былі прыбіты да крыжа жалезнымі цьвікамі. Расьпятага білі плецьцю да таго часу, пакуль усё яго цела не пакрылася крывавымі ранамі, потым да раскалечанага цела прыкладвалі раскаленае жалеза.

На такія зьверствы здольна толькі кляса, якая адчувае прыбліжэньне сваёй пагібелі.

Выступленьні сялянства звычайна падаўляюцца таму, што выступленьні гэтыя неарганізаваны, носяць выпадковы характар. Сялянства ня мае адзінай програмы дзеяньня і не аб'яднана з рабочай клясай, якая мае багаты вопыт рэволюцыйнай барацьбы.

Працоўнае сялянства Эўропы ўлічыла гэтыя недахопы. Зараз у Бэрліне (Нямеччына) пачаў сваю працу ўсеэўрапэйскі зьезд сялянства, які выпрацуе програму барацьбы з абшарнікамі, з іх фашыстаўскімі ўрадамі ў Эўропе і зьвяжа сваю дзейнасьць з рэволюцыйнымі організацыямі рабочае клясы.

У час падрыхтоўкі да зьезду ва ўсіх краінах утвараліся сялянскія камітэты, абіраліся дэлегаты, выпрацоўваліся наказы. Мяркуючы па наказах, якія батракі, беднякі і серадзякі давалі сваім дэлегатам, сялянства Эўропы, улічваючы вопыт нашай Кастрычнікавай рэволюцыі, рашыла цьвёрда змагацца за нізрынуцьце ладу абшарнікаў, за нацыяналізацыю зямлі, за ануляваньне кабальных зьдзелак і г. д.

Буржуазна-фашысцкія ўрады ўсімі мерамі імкнуцца перашкодзіць рабоце ўсеэўропэйскага конгрэсу працоўных сялян. Сялянскія сходы разганяюцца, абраныя дэлегаты арыштоўваюцца, прэса перапоўнена хлусьлівымі нападкамі на організатараў зьезду. Але ўсё гэта не дапаможа капіталістым.

Так-жа, як гарадзкія рабочыя, нягледзячы на забарону вышлі 6-га сакавіка на вуліцу, так і працоўнае сялянства сабралася на свой зьезд і наперакор волі капіталістых і іх паслугачоў, аб'яднаўшыся, нанясе капіталістычнаму ладу апошні удар.

Л. Ч.

Рэдакцыя газэты „Чырвоная Зьмена“ сумесна з домам Чырвонай арміі наладжвае 3-га красавіка, а 8-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні клюбу Карла Маркса вечар сустрэчы чырвонаармейцаў з музычна-компазытарскай і пісьменьніцкай грамадзкасьцю на тэму: „Стварэньне новай чырвонаармейскай песьні“.

Рэдакцыя газэты „ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА“

У барацьбе за прамфінплян

Бясплянавасьць і безгаспадарнасьць, якая мяжуецца са шкодніцтвам

Аўтотранспарт ня мае яшчэ прамфінпляну. Бюрократы з рэчыцкай чыгуначнай станцыі пусьцілі на вецер тысячы рублёў

БЯЗЬЛІТАСНА ГНАЦЬ З САВЕЦКАГА АПАРАТУ БЮРОКРАТАЎ І ВАЛАКІТЧЫКАЎ—ШКОДНІКАЎ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

БАРАЦЬБА СА СТРАТАМІ—БАРАЦЬБА ЗА ПЯЦІГОДКУ

Зьмяшчаемы сёньня матар'ял сьведчыць аб тым, што барацьба са стратамі на нашых заводах і фабрыках яшчэ ў належнай меры не разгарнулася. Расхлябанасьць і бюрократычныя адносіны некаторых гаспадарнікаў прыводзяць да вялікіх страт. Некаторыя прадпрыемствы, як напрыклад аўтотранспарт ня маюць свайго прамфінпляну. Яны ўсю сваю працу робяць бадай што ўсьляпую. У гэты-ж час яны складаюць вялікія правілы ўнутранога распарадку на дзесятках аркушаў паперы. Без малейшай плянавасьці гаспадарнікі закупляюць розныя варштаты і інш. матар'ялы для сваіх прадпрыемстваў, але не скарыстоўваюць іх у належнай меры.

Цэлы шэраг фактаў сьведчыць аб тым, што без належнай зацікаўленасьці партыйных і комсамольскіх організацый, бяз плянавасьці, наша прамысловасьць у некаторых сваіх галінах церпіць вялікія страты. Барацьба са стратамі павінна стаць барацьбой за прамфінплян, за пяцігоду. Страты ў дзесяткі тысяч рублёў, нанесеныя нашай прамысловасьці, дзякуючы галавацяпству асобных працаўнікоў, моцна ўдараюць па ходу нашага будаўніцтва.

Друкуемы сёньня матар'ял павінен раз назаўсёды напомніць некаторым гаспадарнікам аб тым, што наша савецкая грамадзкасьць прымусіць прыслухоўвацца да голасу і думцы рабочых, што ўсякія галавацяпскія ўчынкі, мяжуючыяся з шкодніцтвам, будуць прасечаны.

Гэтым матар'ялам павінна заняцца прокуратура і РСІ з тым, каб раз на заўсёды прывучыць некаторых працаўнікоў цаніць грамадзкую маемасьць і лічыцца з думкамі рабочых. Трэба зацяміць, што барацьба са стратамі ёсьць барацьба за прамфінплян і пяцігодку.

Л. Гл.

Дзе гаспадары?

Хто пакладзе канец безгаспадарнасьці і злачынству ў рэчыцкіх с.-г. майстэрнях?

У рэчыцкіх сельгасмайстэрнях моманты безгаспадарнасьці, злачыннага разбазарваньня дзяржаўных грошай, адсутнасьць адміністрацыйнага кантролю на вытворчасьці моцна даюць сябе адчуваць. Возьмем гісторыю са страгальным варштатам. Варштат пасьля доўгіх спрэчак купляюць на фабрыцы за 200 руб. Але варштат аказаўся патрыманым, ён патрабуе рамонту. Аддаюць яго рамантаваць рвачу і п'яніцу Новікаву.

Той возіцца з рамонтам некалькі месяцаў і нарэшце паведамляе, што рамонт гатоў. Вылучаюць камісію для прыёму варштата, але ён аказваецца нікуды ня вартым. Новікаў тым часам забраў авансам 180 р. Наогул на варштат ўухлопалі 500 рублёў, а карысьці ні на грош.

Вытворчая камісія некалькі раз патрабавала частковай мэханізацыі маслабойкі. У самы гарачы сэзон адміністрацыя знашла, што мэханізацыя непатрэбна, і што наогул няма дзе купіць гідраўлічны прэс. Затым раз, калі прашоў сэзон і ўсюды адчуваецца недахоп у цэмэнце, адміністрацыя купляе за 3 тыс. руб. прэс і пачынае яго ўстанаўліваць. Устанаўлівае яго цэлы месяц (за гэта ўзялі 230 р.), а ў выніку не працуе.

Возьмем факт з пабудовай новай кузьні. Навезьлі цэглы, пяску і з 10 бочкамі цэмэнту прыступаюць да пабудовы такой вялікай кузьні. Пачалі закладваць фундамэнт і стоп... Цэмэнту не хапае, праца прыпынілася.

Нашы гаспадарнікі не жадаюць лічыцца з думкай рабочых і завкомаў, дзякуючы гэтаму на вытворчасьці поўны развал і хаос. Зараз майстэрні перажываюць недахоп ў жалезе. Кузьні, калі ня прыбудзе жалеза, пагражае астаноўка. Добра ведаючы гэта, адміністрацыя выпісвае яшчэ 6 кавалёў з Гомелю. Прыехалі кавалі, а жалеза няма і працы няма, зараз іх перавялі на чорную работу.

У самым галоўным аддзяленьні прадпрыемства—у машынным—таксама бясчынствы. Трубы машын цякуць, патрабуецца безадкладная замена гэтых труб новымі. Інакш машына выйдзе з строю і прадпрыемства стане. Колькі раз аб гэтым заяўлялі гаспадарніку, але той ніякай увагі не зьвяртае.

РСІ і пракуратура павінны тэрмінова заняцца гэтай справай і вылечыць вытворчасьць ад гэтых язваў.

Мануіл Р. Ч.

2.000 комсамольцаў мобілізуюцца ў навучальныя ўстановы

Пастанова сэкратарыяту Мен. АК ЛКСМБ

Мен. АК ЛКСМБ даводзіць да ведама, што пастановаю сэкратарыяту ЦК ЛКСМБ вырашана мобілізаваць 2.000 комсамольцаў у навучальныя ўстановы для ўмацненьня комсамольскага асяродку і ўплыву ў гэтых установах. З гэтага ліку МенАК прадстаўлена 120 месц на 6-месячныя падрыхтоўчыя курсы ВНУ і 60 месц на 6-цімесячныя падрыхтоўчыя курсы ў сельска-гаспадарчыя і індустрыяльныя тэхнікумы. На курсы прымаюцца выключна комсамольцы—рабочыя, батракі беднякі колгасьнікі. Адукацыя для паступаючых на падрыхтоўчыя курсы ў ВНУ 7-8 груп сямігодкі для паступаючых на падрыхтоўчыя курсы ў сельгаспадарчыя і індустрыяльныя тэхнікумы—5-6 груп. Узрост для паступаючых на курсы ВНУ—не маладзей 18 гадоў, а для паступаючых на падрыхтоўчыя курсы ў с-г і індустрыяльныя тэхнікумы не маладзей 15 год. Стыпэндыя для ВНУ—35, р. інтэрнат—15 рублёў, стыпэндыя для тэхнікуму—27 руб. інтэрнат 15 руб. Курсы павінны быць укомплектаваны 15 красавіка г. г.

Заявы прымаюцца ў АПА АК ЛКСМБ і пры Акрапа.

МенАК ЛКСМБ.

Бяз руля і без вятрыл

Адміністрацыя аўтотранспартнага трэсту акапалася кнігамі і паперамі і закінула вытворчасьць. Яна ня цікавіцца тым што робіцца ў майстэрнях і нават адмаўляецца прыходзіць на вытворчыя нарады. За ўвесь гэты час ніводнага разу працаўнікі адміністрацыі ня прысутнічалі на вытворчых нарадах. Прапановы рабочых і нават пастановы вытворчай камісіі адміністрацыяй ня выконваюцца.

Вельмі шпарка растуць у трэсьце адміністрацыйныя выдаткі. Яны складаюць 15.196 рублёў, і гэта толькі за першы квартал па аўтакіраўніцтву. А па аўтакіраўніцтву транспартнага трэсту мы маем дэфіцыт 18.150 руб. і 26 кап. Перавыдатак па рамонту аўтомашын складае 12 тысяч рублёў. Аўтакіраўніцтва ня мае свайго прамфінпляну.

Адміністрацыя забясьпечвае аўтомайстэрні такімі часткамі ад



Аўтотранспарт вельмі зьдзіўлен:
— Што такое? Прамфінплян?
— Яны будуюць, рамантуюць
І бяз пляну шкодзяць нам.

машын, без якіх ёсьць магчымасьць абыйсьціся, а неабходных частак заўсёды не выстарчае. Адміністрацыя заказвае шаблённыя балты, якіх яшчэ хопіць на 3—4 гады, а больш неабходныя прыходзіцца вырабляць уручную, што затрымлівае рамонт машын.

Адміністрацыя купляе „вілкі харнееўскія", плоціць па 192 рублі за штуку, а маючыяся ў нас на складзе здае Дзяржгандльбелу па 17 р. 40 к. Купілі варштат для праточкі цыліндраў для матораў за 1200 р., а як зараз высьветлілася ён ні да чога ня прыгодны, і яго здалі ў Рудмэтальгандаль як лом.



Нас вытворчасьць ня цікавіць—
Пад паперай тонем;
Ў габінэтах закапаліcь,
Ў тэлефоны звонім

Вельмі неэканомна расходуецца змазачны і гаручы матар'ял. Газу і бэнзін проста з бочак льлюць у ванначкі, прычым палова выліваецца на зямлю. Тут неабходны спэцыяльны насос, а яго няма. Масла бяруць з бочкі трэскамі, разам з пяском,—рукамі, жалезам, чым папала толькі не лапаткамі.

На прадпрыемстве не вядзецца ніякай грамадзкай працы. Сходы рабочых часта зрываюцца.

Адміністрацыя ня выконвае колдагавару. БОРМАШЫНКА.

Шкодніцтва ці галавацяпства

Нядаўна пабудаваная цацачная фабрыка на Ляхаўцы займае надта вялікую плошчу. Калі паглядзець, як пабудаваны яе будынкі, дык адразу становіцца зразумелым, што тут ёсьць або шкодніцтва, або проста галавацяпства. Зараз налічваецца 2 гатовыя двухпавярховыя будынкі, у якіх ужо працуюць. Будуюць яшчэ адно памяшканьне для сталярнага цэху. Усе гэтыя будынкі зроблены і абіты сырымі дошкамі, а паміж імі засыпаны сырыя апілкі. Высахшы, гэтыя апілкі асядуць, і ў сьценах зьявяцца дзіркі, праз якія ня толькі будзе сьвістаць вецер, але зможа праляцець і верабей..

Будаўніцтва яшчэ працягваецца. Ім кіруе прараб Пальцаў, які зусім мала наглядае за працай самых будаўнікоў. Слова за адпаведнымі органамі.

ПІЛА.

Шкодніцтва на ст. Рэчыца

Галавацяпства і бюрократызм на ст. Рэчыца працьвітае. Для заводу „Дубіцель" прыбылі на станцыю два вагоны калод, а іх падалі на завод „Інтэрнацыянал". Толькі пасьля разгрузкі спахапіліся, што зрабілі памылку, прышлося калоды перавозіць коньмі. Прызначаную для Жылкоопэрацыю вапну падаюць на завод «імя Томскага». Жылкоопэрацыя чакае вапны, а яна валяецца без карысьці на заводзе. Для хлебазаводу прыбыло 10 вагонаў аўсу, але калі прышлося грузчыкам разгружаць авёс, дык аказалася, што вагон з мяшкамі пакінулі дзесьці на станцыі. У выніку—прагул рабочых і сутачны прастой вагонаў. Парушаецца кодэкс закону аб працы; да пагрузкі дошак дапускаюцца падросткі. З-за недагляду экспэдытара быў пададзен вагон з паломанымі часткамі, што ледзь не прывяло да катастрофы. На другім вагоне пасьля яго разгрузкі была знойдзена лопнуўшая рэсора. З-за казённых адносін да працы адна пляцформа, у якой ня было вушэй, падавалася тры дні падрад. На заводзе „імя Томскага" маецца ветка, але прыбыўшыя грузы разгружаюцца на станцыі. Так, 16 студзеня для заводу прыбылі машынныя часткі вагою ў 800 пудоў, але дзякуючы галавацяпству станцыённых чыноўнікаў груз ня быў паданы па ветцы ў завод, а разгружаны на станцыі.

Неабходна тэрмінова расьсьледваць факты бясчынства.

М. Рэчыцкі.

Дом гніе

Яшчэ ў мінулым годзе Багушэўскай сямігодкай быў куплен у былым панскім маёнтку Зазер'і дом пад інтэрнат. Вучні сямігодкі агульным сходам пастанавілі на перавозку інтэрнату сабраць з кожнага вучня па два з паловай рублі. Дом перавезьлі, але далей аб ім ніхто і не падумаў. Бярвеньні валяюцца пад адкрытым небам—гніюць.

На гэты год закупілі прыватны дом пад інтэрнат, але месц у ім не хапае. Вучняў набілі туды, як селядцоў убочку. Трэба вінаватых у гэтым прыцягнуць да адказнасьці.

ІГРЭК.

Ворша.

Калі загадчыкі разьяжджаюць...

Вялікая безгаспадарнасьць назіраецца ў Гарадоцкай профшколе, Віцебскай акрузі. Калі зайсьці ў час працы ў такарны цэх, дык можна заўважыць, што большасьць варштатаў больш стаіць чым працуе. На ўсіх сходах вучняў, комсамолу, тэхнарадах, гаварылася і пісалася ў насьценгазэце аб тым, што к такарным варштатам неабходна зрабіць хаця-б самыя слабаходныя гаечныя ключы. Але гэта толькі гаварылася. Адміністрацыя школы, а ў прыватнасьці загадчык школы Н. Багданаў *і старшы інструктар Усьцінаў аб гэтым не клапаціліся і ключэй па сёньнешні дзень няма.*

За апошні час загадчык знаходзіцца ў разьездах, лекцыі па спэцыяльных прадметах, якія ён чытае, зрываюцца. Апошні курс, які хутка павінен пайсьці на вытворчасьць, займаецца нерэгулярна.

Цэлы шэраг фактаў гаворыць аб тым, што маючаяся ў профшколе безгаспадарнасьць пагражае плянаваму ходу заняткаў.

Гэтаму неабходна пакласьці канец.

Бел.

Абутнікі рыхтуюцца

Комсамольскі колектыў абутковай фабрыкі (Менск) праводзіць працу па падрыхтоўцы да гадавіны соцспаборніцтва па ўсіх цэхах. Была праведзена конфэрэнцыя моладзі на тэму „выкананьне прамфінпляну і ўдзел моладзі ў гэтай працы". Дакладчыкі і выступаючыя ў спрэчках паказалі твар як лепшых ударнікаў, якія апраўдваюць сваё назначэньне, так і шкоднікаў будаўніцтва.

Конфэрэнцыя з дакладам дырэктара была праведзена і ўсім колектывам.

Зараз вядзем працу па ўцягненьню моладзі ва ўдарныя брыгады і лепшых ударнікаў у комсамол. Лепшых комсамольцаў падрыхтоўваем да перадачы ў партыю. Да 1 мая рыхтуем вечар, прысьвечаны гадавіне соцспаборніцтва.

Менская абутковая фабрыка выйдзе да гадавіны соцспаборніцтва падрыхтаванай.

КАНЦЭЛЬСОН.

ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

Па поваду фэльетону „Восенская любоў і комсамольскія курсы"—„Ч. З." ад 22-ІІ—30 г.

Аўтар фэльетону „Восенская любоў і косамольскія курсы" Нічыпар Краж вілавочна меў на ўвазе: па-першае, завастрыць увагу грамадзкасьці на самым факце ўзаемаадносін дзяўчыны з хлапцом і поглядах іх на сумеснае жыцьцё; па-другое, дапамагчы курсам вылезьці з абывацельшчыны плётак, якія пануюць на курсах згодна сцьвердажаньню фэльетону; па-трэцяе дапамагчы курсам разарваць скарлупу замкнутасьці, адарванасьці ад акаляючага жыцьця, таго жыцьця, якім жыве зараз уся партыя, увесь Саюз.

Мы ў гэтым допісе хочам паказаць наколькі аўтару фэльетону гэта ўдалося, якую грамадзкую ролю адыграў фэльетон.

Сам па сабе факт восеньскага каханьня паміж вайскоўцам з АБВШ і нашай курсанткай сапраўды меў месца. Правільна і тое, што дзяўчына пры гэтай разьвязцы страціла прытомнасьць, але тое, што гэтая дзяўчына курсантка жадала пакончыць самагубствам і толькі асобныя таварышы перасьцераглі яе ад гэтага, зусім не адпавядае сапраўднасьці. Пры гэтай трагічнай гісторыі ня было нікога з курсантаў і толькі адна з найбольш блізкіх таварышак гэтай курсанткі даведалася аб гэтым з яе-ж слоў.

Бязумоўна, сам вышэйпрыведзены факт заслугоўвае ўвагі грамадзкасьці з таго боку, што мужчына-партыец глядзеў на дзяўчыну не як на таварыша, а як на самку і пагэтаму адно слова аб тым, што яна была ўжо замужам было дастатковым, каб уся восенская любоў кончылася трагэдыяй. Пагэтаму пры абгаварэньні фэльетону на сходзе ячэйкі КП(б)Б і ЛКСМБ зусім правільна было адзначана, што такі ўчынак з боку мужчыны-партыйца зьяўляецца непартыйным. Па-нашаму трэба, каб гэтай справай заняўся партколектыў АБВШ, Тое, што замест падтрыманьня таварыша, яго моральнага духу, вакол гэтай гісторыі падняліся плёткі на курсах, што маленькія і вялікія групкі на розныя лады перапявалі гэты фатк, зьяўляецца выдумкай таму, што апрача дзьвёх дзяўчат курсантак, якія аб гэтым ведалі, для астатніх самы факт быў зусім невядомым і таму ня дзіва, што пры абгаварэньні фэльетону трэба было шукаць яго гэроя.

Аўтар фэльетону, выдумаўшы „спляшныя плёткі" на курсах, лёгічна выводзіў, што раз на курсах галоўнае—плёткі, значыцца курсы адарваліся ад жыцьця за плёткамі застаецца ня чутным буйное будаўніцтва фабрык, заводаў, фабрычных пасёлкаў, саўгасаў, комун і г. д. Гэта зьяўляецца самым цяжкім абвінавачваньнем для курсаў і таму пытаньне ці адпавядае гэта сапраўднасьці павінна цікавіць усю грамадзкасьць. Паспрабуем пералічыць тыя каналы, якія зьвязваюць курсы і, па-нашаму, цесна зьвязваюць з акаляючым жыцьцём. Будзем гаварыць фактамі.

На працягу ўсёй кампаніі мобілізацыі кадраў піонэрпрацаўнікоў усе курсанты актыўна ўдзельнічалі ў гэтай рабоце, часткай у менскіх ячэйках а 20 чалавек нават былі скарыстаны ЦК і АК на гэтай рабоце ў раёнах і акругах.

Курсы ўзялі на сябе абавязак дапамагчы Койданаўскай організацыі ў правядзеньні трохмесячніку беларускай і нацменаўскай пролетарскай культуры. 10 чалавек у час канікул у лік свайго адпачынку на працягу 5-ці дзён дапамагалі Койданаўскай організацыі. Акрамя гэтага былі скарыстаны два выхадныя дні для паездкі ў Койданава брыгады з 20 чалавек.

Адпрацаваны на менскіх прадпрыемствах тры нядзельнікі ў карысьць індустрыялізацыі і праведзен нядзельнік па збору ўтыль-сыравіны.

Група комсамольцаў прымацавана да вясковай ячэйкі, якая там заўсёды вядзе работу.

Праведзена сустрэча бытавых комун з ячэйкай Політэхнікуму.

У час зімовых канікул за выключэньнем адзінак, усе курсанты прымалі практычны ўдзел у колектывізацыі і ў раскулачваньні.

Організаваны налёты „лёгкай кавалерыі" па праверцы збору попелу ўстановамі і прадпрыемствамі Менску, праведзен сумесна з „Чырвонай Зьменай" налёт на політшколу Менску.

І нарэшце, іменна таму, што курсы блізка адчуваюць акаляючае жыцьцё, непарыўна з ім зьвязаны, мы замест таго, каб правесьці практыку ў летнія месяцы, парашылі праводзіць яе зараз улічваючы тое, што гэтая вясна для нас на вёсцы зьяўляецца вясной рашаючай.

Ніхто ня будзе адмаўляцца ад таго, што ёсьць недахопы ў працы курсаў комсамольскага актыву. Правільна аўтар піша аб тым, што ў нас не наладжана дапамога адстаючым, правільна і тое. што ёсьць асобныя зьявы нетаварыскасьці, нячуласьці, што курсы па сваёй якасьці ўкомплектаваны нездавальняюча, што ўжо трох чалавек выключылі з курсаў за захаваньне социяльнага паходжаньня, але ў цэлым колектыў курсаў зьяўляецца колектывым здаровым, спаяным, цалкам жывучым, разам з партыяй, з комсамолам і адчуваючым пытаньне соцыялістычнага будаўніцтва.

Агульны вывад. Аўтар, які пісаў фэльетон, ня ведае чым жывуць курсы і карыстаўся пры складаньні яго толькі чуткамі, а сам іх не праверыў. Фэльетон не адпавядае сапраўднасьці, а таму ня мае ніякай грамадзкай значнасьці!

Садоўскі.
Фрыдман.
Заванкоў.

АД РЭДАКЦЫІ

Зьмяшчаючы адказ таварышоў з курсаў комсамольскага актыву на фэльетон «Восенская любоў і комсамольскія курсы», які быў зьмешчаны у «Ч. З.» ад 22-ІІ г.г., рэдакцыя лічыць неабходным зрабіць наступныя заўвагі:

Аўтары ліста, ня маючы падстаў абвергнуць таго, што сам факт, апісаны ў фэльетоне, меў месца, усё-ж імкнуцца змазаць сутнасьць справы, даказаць недаказуемае.

У лісьце гаворыцца: «Бязумоўна, сам вышэйскладзены факт заслугоўвае ўвагі грамадзкасьці з таго боку, што мужчына партыец глядзеў на дзяўчыну, не як на таварыша, а як на самку». І далей: „Па-нашаму трэба, каб гэтай справай заняўся партколектыў АБВШ".

Так, таварышы, мы падтрымоўваем вашу думку ў адносінах таго, што партколектыў АБВШ павінен заняцца гэтай справай. Учынак партыйца, курсанта з АБВШ зьяўляцца бязумоўна антыпартыйным. Але мы лічым заслугоўваючым увагі і тое, што на курсах, якія павінны зьяўляцца прыкладам колектыўнага жыцьця, вузорам таварыскіх узаемаадносін, менавіта тут, ніхто, акрамя адной, як гаворыцца ў лісьце «з найбольш блізкіх таварышак», ня ведаў і ня цікавіўся сутнасьцю гэтай „трагедыі" і гэта гаворыцца разам з тым, што на курсах быў вядомы выпадак са стратай прытомнасьці і г. д.

Нават партыйна - комсамольскі сход курсаў, абмяркоўваючы фэльетон, па сутнасьці займаўся разглядам пытаньня: «правільна зрабіла рэдакцыя «Чырвонай Зьмены», зьмясьціўшы гэты фэльетон, ці няправільна», але амаль ніхто не гаварыў па сутнасьці справы, нікога, мусіць, на курсах такія «трагедыі» ня цікавяць.

Пасьля гэтага становіцца зусім ясным, што асабістым жыцьцём, асабістымі „трагэдыямі" асобных комсамольцаў колектыў цалкам ня цікавіцца. Невыпадкова ў зьвязку з гэтым, што на курсах існуюць нават такія яўна-абывацельскія настроі накшталт таго, што: „комсамол і газэта, а ў прыватнасьці «Чырвоная Зьмена» ня маюць права ўмешвацца ў асабістае жыцьцё комсамольцаў". Мы думаем, што гэты факт сам дае сабе поўную ацэнку.

Аўтары ліста прыводзяць шэраг фактаў, якія накіраваны на тое, каб давесьці, што курсы не адарваны ад жыцьця і галоўнае, каб давесьці, што фэльетон ня мае ніякага грамадзкага значэньня.

Мы ня думаем спрачацца аб тым, што курсы правялі шмат прац (як гэта і належыла быць) па шэрагу кампаніі і г. д. Таму, што калі-б курсы адарваліся ад таго, чым жыве зараз краіна, вывады патрэбна было б рабіць бязумоўна зусім іншыя. Мы ўпэўнены, што да гэтага курсы не дайшлі. Але зусім нічэмнымі зьяўляюцца імкненьні давесьці, што факт, апісаны ў фэльетоне, ня мае грамадзкага значэньня. Патугі аўтараў давесьці гэта, ёсьць нішто іншае, як патаканьне яўна абывацельскім настроям, якія, на вялікі жаль, яшчэ існуюць на курсах.



Рабочы за цыркуляркай

Тав. Міцькоў—старшыня Белколгасцэнтру

У сувязі з тым, што Белкалгасцэнтру надаюцца функцыі кіруючага органу ўсёй калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы, прэзыдыум савету Калгасьцэнтру пастанавіў пашырыць склад праўленьня Калгасцэнтру да 11 асоб.

Старшынёй праўленьня Белкалгасцэнтру абраны тав. Міцькоў (заг. сэкт. масавых кампаній ЦК КП(б)Б), намесьнікамі старшыні т. Сьмірноў і Стрэле.

Новы старшыня праўленьня Белкоопсаюзу

У сувязі з назначэньнем т. Ба... ціна наркамгандлем БССР, старшынёю праўленьня Белкапсаюз... выбраны т. Хаскін.

Ад рэдакцыі

У нумары 75 „Чырвонай Зьмены" быў зьмешчан фэльетон Цішкі Вернага пад загалоўкам: „Гром перамогі раздавайся". Зьмяшчаючы гэты фэльетон рэдакцыя ня мела на ўвазе абагульваць абураючыя факты перегібаў і грубых скажэньняў лініі партыі, якія яшчэ маюцца ў асобных мясцох дзякуючы галавацкістаў асобных гара-работнікаў. Дзякуючы таму што аўтар не гаворыць аб ко...крэтным выпадку, ствараецца ўр...жаньне, што гэта не асобны факт а сыстэма работы па колектывіза...цыі. Такая падача фэльетону зьяўляецца няправільнай, а адсюль зьмяшчэньне гэтага фэльетону рэдакцыя лічыць памылковым.

Шахматы і шашкі

Шашачны эцюд А. Дагмана (Ворша)

Белыя Дh4. пр—d4 g3, g7(4)
Чорныя: Дb6., пр b3, c5, c7.d8(5)

Белыя выігрываюць

Шахматная хроніка

ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫЯ КАМІСІІ ЦСПСБ заслухалі справаздачу штабу па правядзеньню 5-дзёньніка шахматыстага і шашыстага аб выніках 5-дзёньніка. 5-дзёньнік меў вялікае значэньне ў популярызацыі шахмат і шашак сярод рабочых. За час 5-дзёньніка былі праведзены на 18 буйнейшых прадпрыемствах і 6-ці клюбах сэансы адначасовай гульні, у якіх было ахоплена звыш 600 рабочых. Трэба адзначыць, што ЦП саюзаў, нізавыя профорганізацыі і комсамольская ячэйкі слаба ўдзельнічалі ў падрыхтоўцы і правядзеньні пяцідзёньніку. Пяцідзёньнік ня быў выкарыстаны большай часткай профорганізацый дзеля організацыі гурткоў, масавых спаборніцтваў на прадпрыемствах і ўтварэньня шахматна-шашачнага актыву і ш-ш камісія пры ЦП саюзаў.

У МЕНСКУ АДБЫЎСЯ ПЛЕНУМ цэнтральнай шахматна-шашачнай сэкцыі ВСФКБ. Пленум устанавіў кантрольныя лічбы колькаснага складу ш-ш. гурткоў. Да 1-га кастрычніка гэтага году ш. ш. гурткамі па БССР павінна быць ахоплена ў гарадох ня менш 12 тыс... і па вёсках ня менш 7 тысяч.

ПАМІЖ РСФСР, БССР І УСС... спачатку мая начнецца матч-турн... па перапісцы. З кожнага бо... прымуць удзел па 100 шахмат...стых і 75 шашыстых.

КУЛЬТСЭКТАР ЦСПСБ АДЧЫНЯ... КУРСЫ ШАХМАТНА-ШАШАЧНЫ... інструктароў, разьлічаныя на ... месц. Пакуль пададзена 60 заяў, іх 48 ад рабочых. Трэба адзначы... невялікую колькасьць комсамол...цаў, падаўшых заявы на курс... Атрымана 12 заяў ад партыйцаў 10 ад комсамольцаў. Заняткі па...нуцца ў першых чыслах красавік...

ПАЧАЛІСЯ Ш-Ш СПАБОРНІЦТВ... паміж скуранымі заводамі (Менс... Удзельнічаюць 6 прадпрыемства... па 15 ігракоў з кожнага.

ШАШАЧНЫ МАТЧ ПАМІЖ БУ...ДАЎНІКАМІ і мэталістымі (Менс... скончыўся з вынікамі +9-8 у к...рысьць мэталістых.

Выклік Гольцмана прыняты

РАБОЧЫ, БУДАЎНІК-КОМСАМО... Т. СКАКОЎСКІ, даў згоду гуля... па перапісцы (згодна выклік... тав. Гольцмана) у шахматы, ... ўмовах ужо друкаваных у „Чы...вонай Зьмене".

ЗА НОВУЮ ПРОЛЕТАРСКУЮ ЧЫРВОНААРМЕЙСКУЮ ПЕСЬНЮ

Яшчэ і зараз, на 13 годзе пролетарскай рэволюцыі, на 13 годзе існаваньня Чырвонай арміі часам можна яшчэ на вуліцах нашых гарадоў пачуць:

Распустила Дунька косы
А за нею все матросы.

альбо:

Цыганочка ока-ока
Цыганочка черноока,
Цыганочка чорная завлекла.

Бязумоўна гэта зьявішча зусім ненармальнае, бо такія песьні ні зьместам, ні мелёдыяй ня могуць задаволіць нашу Чырвоную армію. За апошні час у галіне стварэньня бадзёрай чырвонаармейскай пролетарскай песьні наглядаецца зрух. Нашымі композытарамі і пісьменьнікамі напісан шэраг пролетарскіх чырвонаармейскіх песьняў і гэтыя песьні, ня глядзячы ня няданы іх выпуск у сьвет ужо распаўсюдзіліся па чырвонаармейскіх частках. У нас на Беларусі ў галіне стварэньня новай пролетарскай чырвонаармейскай песьні зроблена яшчэ мала, і нават маючыяся песьні вельмі марудным тэмпам прасоўваюцца ў чырвонаармейскія часткі. З мэтай стварэньня на Беларусі новай чырвонаармейскай пролетарскай песьні, яе популярызацыі сярод чырвонаармейскіх мас рэдакцыя „Чырвонай Зьмены", разам з Домам Чырвонай арміі, наладжвае сёньня ў клюбе Комасьветы сустрэчу чырвонаармейскіх частак з пролетарскімі пісьменьнікамі і композытарамі гораду Менску. Гэтая сустрэча павінна будзе даць моцны штуршок для далейшага пасьпяховага разьвіцьця беларускай пролетарскай чырвонаармейскай песьні. Гэта-ж сустрэча адным з сваіх вынікаў павінна будзе даць шэраг ударных брыгад пролетарскіх засьпевакоў, композытараў, пісьменьнікаў па абслугоўваньню Чырвонай арміі.



Абсталяваньне ленкуткa

Паштовая скрынка

Колгасьніку—„Воўк у авечай скуры", К. Н.—„Кулацкая выхадка", Хутрову—„Мы не адстаем", Стахоўскаму—„Не матар'ял, а клевета", Сярнёву—„Кулакам ня ўдалося", Зампэру—„Паміж чатырох, а перавыбараў няма", Пчолцы—„Шкоднікі ў праўленьні колгасу", Шыпшын—„П'яніцы арудуюць", Салавой—„Больш культсіл у вёсцы, Калаўцаву—„Трывога па зборы ўціль-сыравіны", Сябру драмгуртка—„Як ідуць на сустрэчу вёскі", Юнкору—„Дукорскія комсамольцы нічога ня ведаюць аб лесазагатоўках, Бліннкоў—„Кулакі арудуюць", Архіп—„Пастановы на паперы", Комсамольцу—„Стаяць у баку", Банаху—„Комуна „Чырвоная Паляна", Пісарчыку „Бярыце прыклад, мы маем посьпехі". Лось „На барацьбу з дызэртырамі колектывізацыі", Юмору. „Наша хата, мы нічога не знаем", Шмалю. „Чым гэта назваць", Пракопеніка. „Неабходна падняць сельскую гаспадарку", Бяздольнаму „Ліст з Сібіры". Урбоновіч. „На сьмену", Убачыўшаму. „Суд над кулаком", Гурэвіч. „Аб кулацкім кіраўніцтве Перагуда", Ко...гасьніку. „ШСМ выгадавала", Стр...вому. „На словах адно, а на спра...другое", Лапаць. „Цягнуцца ў хвас...це", Комчык Янка. „Кулакі зрываю... пасеўкампанію", Чырвонкову. „Наш... задача", Звону. „Слаба", Іткіну. „В...трымалі баявы экзамен", Комс...мольцу. „Галасую супроць", Лос...маву—„Ці харошыя з іх комсамол...цы", Цырэльсону—„З беларусізацыя... дрэнна", Ермаку і Семяніне—„За в...кананьне трохмесячніка", Фрыду—„Сельсавет ня цікавіцца", „Радые... вёску" і „яшчэ не ставілі", Наг... Пятрусь—„Зьнішчым цемру", Ерма... К.—„Няма часу", Багдан М.—„А... ячэйцы будаўнікоў Барысава", і Чыр...вонаму лістку—„Беспартыйная ма... моладзі далёка ад КСМ"—допіс... друкавацца ня будуць.

Адказны рэдактар
Рэдколегія

Мен..., друкарня БДВ.

Галоўлітбел № 599